■ ПАРЛАМЕНЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

# У адпаведнасці з патрабаваннямі часу

**29 чэрвеня завяршыла работу чацвёртая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання. Пра гэта — размова з дэпутатам Валянцінай Вітальеўнай Ражанец.**

***– Раскажыце, калі ласка, пра асноўныя прыярытэты і вынікі працы.***

– Як адзначыў у заключнай прамове старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзімір Паўлавіч Андрэйчанка, асноўным прыярытэтам для дэпутацкага корпуса ў гэты перыяд стала вырашэнне задач, пастаўленых Прэзідэнтам краіны ў яго Пасланні беларускаму народу і Парламенту.

Падчас сесіі разгледжана больш за 60 пытанняў, прыняты шэраг сістэмных заканадаўчых мер па развіцці фінансава-крэдытнай і інвестыцыйнай палітыкі, галін рэальнага сектара і сацыяльнай сферы, умацаванні нацыянальнай бяспекі, законнасці і правапарадку.

Ратыфікаваны рад пагадненняў у розных сферах супрацоўніцтва з іншымі краінамі. Нашай камісіі, напрыклад, было даручана падрыхтаваць да разгляду на сесіі праект закона «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб абмене інфармацыяй у рамках Садружнасці Незалежных Дзяржаў у сферы барацьбы з тэрарызмам і іншымі гвалтоўнымі праявамі экстрэмізму, а таксама іх фінансаваннем». У адпаведнасці з Пагадненнем бакі абавязуюцца забяспечваць абмен інфармацыяй, выкананне прававога рэжыму інфармацыйных сістэм, абарону сакрэтнай інфармацыі, якая выкарыстоўваецца ў працэсе абмену, у адпаведнасці з заканадаўствам дзяржаў, а таксама міжнароднымі дагаворамі.

Карэкціроўка Банкаўскага кодэкса, удасканаленне Падатковага кодэкса, механізмаў дзяржаўна-прыватнага партнёрства, павышэнне празрыстасці дзяржзакупак і спрашчэнне працэдур па міжнародных дагаворах накіраваны на ўсталяванне належных умоў для вядзення бізнесу. Сур'ёзная нарматворчая праца па стварэнні прынцыпова новага бізнес-



клімату, па сутнасці, толькі пачынаецца, многае давядзецца рабіць упершыню.

Папраўкі ўносяцца ў Крымінальны, Крымінальна-працэсуальны і Крымінальна-выканаўчы кодэксы Рэспублікі Беларусь. Шэраг змяненняў выкліканы неабходнасцю дэкрыміналізацыі дзеянняў, якія не валодаюць дастатковай ступенню грамадскай небяспекі і не патрабуюць прыцягнення асоб, якія іх учынілі, да адказнасці ў парадку крымінальнага судаводства.

Змены будуць тычыцца Працоўнага кодэкса і некаторых законаў па пытаннях працоўных адносін. Праектам Закона, прынятага ў першым чытанні на апошнім пасяджэнні чацвёртай сесіі, прадугледжваецца змяненне істотных умоў працы, парадак скасавання працоўнага дагавора па ініцыятыве наймальніка. Замацоўваюцца асаблівасці рэгулявання працы работнікаў, з якімі заключаюцца кантракты і якія ажыццяўляюць дыстанцыйную працу, удакладняюцца парадак і ўмовы пераводу работніка да іншага наймальніка, замацоўваюцца дадатковыя гарантыі грамадзянам, звольненым з ваеннай і альтэрнатыўнай службы. Улічваюцца сучасныя тэндэнцыі на рынку працы і больш гібка рэгулююцца пытанні забеспячэння занятасці. Праект закона рыхтуецца да другога чытання.

Работа над законапраектамі ідзе максімальна адкрыта, грамадскасць уважліва сочыць за ходам іх падрыхтоўкі і дапрацоўкі. У прыватнасці, на пасяджэнні рабочых груп па дапрацоўцы да другога чытання праектаў законаў аб унясенні змяненняў у законы аб масавых мерапрыемствах, СМІ ў Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі запрашалі прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў, некаторыя з прапаноў знайшлі ўвасабленне ў тэкстах праектаў законаў. Адбыліся сустрэчы з кіраўніком прадстаўніцтва ЕС у Рэспубліцы Беларусь і часовым паверанным у справах ЗША ў Беларусі.

***– Акрамя заканатворчасці, чым вызначылася першая палова года?***

– Перыяд быў насычаны. У міжнародным супрацоўніцтве важна прадставіць вобраз Беларусі на сусветнай арэне як IT-краіны, а таксама ідэі паглыблення эканамічнай інтэграцыі на кантыненце, заручыцца падтрымкай ініцыятывы аб перазапуску хельсінкскага працэсу на прынцыпах даверу і супрацоўніцтва.

Прыносіць плён канструктыўны дыялог з парламенцкімі дэлегацыямі замежных краін, ёсць прагрэс у дзейнасці Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі.

Камісія па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі, у якой я працую, правяла выязныя пашыраныя пасяджэнні сумесна з Камісіяй Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі па інфармацыйнай палітыцы ў Гомелі і Гродне. Мне было даручана прадставіць ініцыятыву па правядзенні конкурсу рэгіянальнай прэсы на лепшы матэрыял аб будаўніцтве Саюзнай дзяржавы. Прапанова знайшла падтрымку і ёсць спадзяванні, што працяг увасобіцца ў цікавы праект.

***– Паміж сесіямі над чым працуеце?***

– Міжсесійны перыяд не менш напружаны, ідзе інтэнсіўная падрыхтоўка праектаў законаў да разгляду на чарговай сесіі, працуюць рабочыя групы, праводзяцца круглыя сталы, семінары і многія іншыя мерапрыемствы. 5 ліпеня, напрыклад, адбыўся круглы стол на тэму «Медыяцыя: сучасны стан і перспектывы развіцця». Абмеркаванне было арганізавана Пастаяннай камісіяй па заканадаўстве, у ім удзельнічалі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, члены Савета Рэспублікі, а таксама прадстаўнікі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Беларускай натарыяльнай палаты, Беларускай рэспубліканскай калегіі адвакатаў, медыятары. Вывучалі практыку прымянення медыяцыі ў краіне, абмяркавалі магчымасці і перавагі выкарыстання гэтага інстытута для ўмацавання прававой дзяржавы і грамадзянскай супольнасці.

На думку ўдзельнікаў пасяджэння, медыяцыя забяспечвае канфідэнцыяльнасць і добраахвотнасць прыняцця рашэння на ўзаемавыгадных прымальных умовах. У нашай краіне ў эканамічных судах з дапамогай медыятараў вырашаецца 70% канфліктаў. Чаму б гэты інстытут не апрабаваць і на шлюбна-сямейных праваадносінах – яны складаюць каля 30% спраў, якія разглядаюцца ў судзе.

На стварэнне ўмоў для актыўнага прымянення медыяцыі для ўрэгулявання сямейных спрэчак і канфліктаў, захавання сям'і, забеспячэння правоў і законных інтарэсаў мужа і жонкі і дзяцей накіраваны законапраект «Аб змяненні кодэксаў па пытаннях медыяцыі», які зараз знаходзіцца ў распрацоўцы.

Раней прайшоў таксама цікавы і карысны дыялог, арганізаваны Пастаяннай камісіяй па эканоміцы, па вывучэнні практычных аспектаў рэалізацыі Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 23 лістапада 2017 года №7 «Аб развіцці прадпрымальніцтва». І гэта толькі некаторыя прыклады.

Акрамя заканатворчай дзейнасці, дэпутаты працягваюць работу ў сваіх акругах: кожны месяц праводзім прыёмы грамадзян, «прамыя лініі», сустрэчы з насельніцтвам і ў калектывах.

Выказваю ўдзячнасць усім за супрацоўніцтва, неераўнадушнае стаўленне да жыцця рэгіёна, слушныя прапановы і падтрымку ў вырашэнні надзённых задач.

**Ірына КАВАЛЕНКА.**

# Слуцкий РОВД:

## итоги подведены, задачи поставлены

**В отделе внутренних дел Слуцкого райисполкома были подведены итоги оперативно-служебной деятельности за шесть месяцев 2018 года. В общем собрании отдела принял участие первый заместитель начальника УВД Минского облисполкома — начальник криминальной милиции полковник милиции Вадим Мурин.**

В ходе выступлений начальника отдела Владимира Герего и его заместителей были озвучены основные показатели оперативно-служебной деятельности РОВД. Так, по итогам полугодия раскрываемость преступлений по линии уголовного розыска составила более 78%, что является одним из лучших показателей в Республике Беларусь среди отделов внутренних дел третьей категории.

Положительные результаты принесли регулярные мероприятия по профилактике преступности и правонарушений в сфере семейно-бытовых отношений, в подростковой среде, в общественных местах.

В сфере обеспечения безопасности дорожного движения также удалось добиться позитивных наработок: благодаря профилактическим мерам отмечается снижение количества дорожно-транспортных происшествий и числа погибших в автокатастрофах на дорогах Слуцкого района.

Закончилось оперативное совещание на оптимистической ноте: шести сотрудникам Слуцкого РОВД были присвоены специальные звания. Медалью «За безупречную службу» III степени был поощрен начальник отдела ГАИ майор милиции Александр Станкевич.

**Андрей ЗАЯЦ,**
**заместитель начальника Слуцкого РОВД.**

# Объявлен конкурс социальных роликов

**Генеральная прокуратура Российской Федерации объявляет о проведении международного молодежного конкурса социальной антикоррупционной рекламы «Вместе против коррупции!».**

Соорганизаторами выступили: Генеральные прокуратуры Республики Армения, Республики Беларусь, Кыргызской Республики, Агентство Республики Казахстан по делам государственной службы и противодействию коррупции, Агентство по государственному финансовому контролю и борьбе с коррупцией Республики Таджикистан.

Конкурс будет проходить под эгидой образованного в 2013 году Межгосударственного совета по противодействию коррупции, членами которого являются Армения, Беларусь, Казахстан, Кыргызстан, Россия и Таджикистан.

Конкурсантам в возрасте от 14 до 35 лет предлагается подготовить свои работы в формате плакатов или видеороликов.

Заявки будут приниматься на официальном сайте **www.anticorruption.life со 2 июля по 19 октября 2018 года.**

По мнению организаторов конкурса, индивидуальная авторская визуализация коррупции как международной проблемы сможет стать дополнительным эффективным инструментом профилактики данного вида преступлений и будет содействовать формированию в общественном сознании нетерпимости к любым коррупционным проявлениям.

Торжественную церемонию награждения победителей конкурса планируется приурочить к Международному дню борьбы с коррупцией 9 декабря 2018 года.